# Умовы конкурсу на атрыманне падтрымкі ў межах праграмы «Грамадзянская супольнасць для развіцця Беларусі» на перыяд з 20 лістапада па 31 снежня 2023 г.

Дата публікацыі: 20 лістапада 2023 г.

## ЗМЕСТ


1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ КОНКУРСУ ........ 1
2. ПРЫЯРЫТЭТЫ КОНКУРСУ ........ 2
3. ПАТРАБАВАННІ ДА ЗАЯЎНІКАЎ ........ 2
4. УМОВЫ ФІНАНСАВАННЯ ........ 3
5. ПРАЦЭДУРА ПАДАВАННЯ ПРАЕКТНЫХ ПРАПАНОЎ ........ 4
6. АЦЭНКА І АДБОР ПРАЕКТНЫХ ПРАПАНОЎ ........ 5
7. ДАДАТКОВАЯ ІНФАРМАЦЫЯ І ПЫТАННІ ........ 6


## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ КОНКУРСУ

1.1. Конкурс праводзіцца з агульнай мэтай захавання і развіцця патэнцыялу беларускіх арганізацый грамадзянскай супольнасці (АГС).

1.2. Бюджэт запытанай падтрымкі можа складаць ад **8 000 да 20 000 еўра.** Пры гэтым аплата ўсіх паслуг і тавараў, неабходных для выканання праекта, будзе ажыццяўляцца **непасрэдна з рахунка грантадаўцы.**

1.3. Працягласць праектаў можа складаць да 5 месяцаў, у залежнасці ад даты пачатку рэалізацыі праекта (гл. падрабязней у п. 5.3.).

1.4. У межах конкурсу будуць падтрыманы толькі тыя праектныя прапановы, якія адпавядаюць агульнай мэце конкурсу і пададзены паводле яго патрабаванняў.

1.5. Арганізацыя/ініцыятыва можа падаць на конкурс толькі адну праектную прапанову.

1.6. У выпадку, калі заяўнік ужо выконвае праект, які быў раней падтрыманы праграмай, або чакае вынікаў ацэнкі пададзенай праектнай прапановы ў межах іншых конкурсаў праграмы, гэта арганізацыя/ініцыятыва можа падаць новую заяўку на конкурс.

## 2. ПРЫЯРЫТЭТЫ КОНКУРСУ

2.1. У рамках конкурсу будуць падтрыманы праекты, накіраваныя на развіццё патэнцыялу саміх арганізацый-заяўнікаў, у тым ліку асацыяцый арганізацый.

2.2. Могуць быць **падтрыманы наступныя віды дзейнасці**:

- правядзенне арганізацыйнай дыягностыкі;
- стратэгічнае і аперацыйнае планаванне, сесіі па пераглядзе бягучых стратэгій і планаў;
- правядзенне рэтрытаў;
- навучанне і падтрымка супрацоўнікаў/-ніц і валанцёраў/-ак, уключаючы аказанне псіхалагічнай падтрымкі;
- атрыманне кансультацый па пытаннях арганізацыйнага развіцця;
- распрацоўка і ўкараненне палітык і працэдур;
- ацэнка эфектыўнасці дзейнасці;
- мерапрыемствы па павышэнні эфектыўнасці дзейнасці кіруючых органаў.

2.3. Праекты могуць уключаць толькі мірную грамадзянскую дзейнасць.

2.4. Недапушчальнымі ў гэтым конкурсе з'яўляюцца наступныя віды дзейнасці:

- дзейнасць, звязаная толькі ці пераважна з фінансавай падтрымкай удзелу пэўных асоб у працоўных сустрэчах, семінарах, канферэнцыях і кангрэсах, якія праводзяцца іншымі арганізацыямі;
- дзейнасць, звязаная толькі ці пераважна з выдачай індывідуальных стыпендый для навучання ці ўдзелу ў адукацыйных курсах;
- дзейнасць, якая заключаецца ў капітальных укладаннях, напрыклад, набыцці зямлі, будынкаў, абсталявання і транспартных сродкаў;
- дзейнасць, якая дыскрымінуе пэўных асоб або групы людзей паводле полу, сексуальнай арыентацыі, рэлігійных перакананняў або адсутнасці такіх, або паводле этнічнага паходжання;
- дзейнасць, якая змяшчае заклікі да гвалту;
- дзейнасць, накіраваная на падтрымку палітычных партый.

## 3. ПАТРАБАВАННІ ДА ЗАЯЎНІКАЎ

3.1. Падаць заяўку на конкурс могуць **беларускія арганізацыі грамадзянскай супольнасці** – некамерцыйныя самакіраваныя арганізацыі, якія аб'ядноўваюць людзей па прынцыпе добраахвотнасці і не асацыяваны з дзяржавай:

- зарэгістраваныя ў Беларусі грамадскія аб'яднанні, фонды, асацыяцыі (саюзы) юрыдычных асоб, некамерцыйныя ўстановы;
- ініцыятыўныя групы грамадзян;
- грамадскія арганізацыі, якія зарэгістраваны за мяжой і вядуць дзейнасць для дэмакратычнага развіцця Беларусі;
- незалежныя прафсаюзныя арганізацыі;
- бізнес-асацыяцыі, клубы і іншыя бізнес-супольнасці, якія аб'ядноўваюць беларускі бізнес у Беларусі і за яе межамі.

3.2. Заяўнікі будуць выключаны з удзелу ў конкурсе ў выпадку, калі:
- яны не адпавядаюць вышэйадзначаным патрабаванням;
- яны і/або іх паўнамоцныя прадстаўнікі не выконваюць прынцып пазбягання канфлікту інтарэсаў;
- існуюць факты здзяйснення імі парушэнняў у рэалізацыі і адміністраванні грантавых праектаў (атрыманне падвойнага фінансавання або іншыя сур'ёзныя парушэнні);
- іх прадстаўнікі і/або звязаныя з імі арганізацыі і асобы знаходзяцца ў санкцыйных спісах Еўрапейскага Саюза і краін-членаў ЕС ці звязаны з арганізацыямі або асобамі ў такіх спісах.

3.3. Органы дзяржаўнай улады, дзяржаўныя арганізацыі, арганізацыі, асацыяваныя з дзяржавай, а таксама палітычныя арганізацыі, рухі і партыі **не могуць** падаваць праектныя прапановы і быць партнёрамі па праектах у межах дадзенага конкурсу.

## 4. УМОВЫ ФІНАНСАВАННЯ

4.1. **Аплата ўсіх паслуг і тавараў, неабходных для выканання праекта, будзе ажыццяўляцца непасрэдна з рахунка грантадаўцы.** Грантаатрымальнік павінен будзе своечасова падаваць грантадаўцу інфармацыю і дакументы, неабходныя для аплаты выдаткаў, а таксама прадастаўляць апісальныя справаздачы і пацверджанні дасягнення вынікаў праекта.

4.2. Уся фінансавая дакументацыя і выплаты павінны ўлічваць патрабаванні заканадаўства Літоўскай Рэспублікі.

4.3. Запытаная фінансавая падтрымка можа ўключаць аплату выдаткаў на:
- паслугі зместавых і адміністрацыйных каардынатараў, экспертаў, тэхнічных спецыялістаў і г.д., неабходныя для ажыццяўлення дзейнасці;
- арэнду памяшкання для правядзення мерапрыемстваў*;

- арэнду абсталявання, неабходнага для правядзення мерапрыемстваў*;
- вытворчасць рэкламнай/друкаванай прадукцыі;
- пражыванне ўдзельнікаў*;
- харчаванне ўдзельнікаў*;
- праезд удзельнікаў мерапрыемстваў з іншых краін/гарадоў;
- канцылярскія тавары для правядзення мерапрыемстваў;
- іншыя тавары і паслугі, неабходныя для рэалізацыі праекта, за выключэннем выдаткаў, пералічаных у пункце 4.5. ніжэй.

*Выдаткі, пазначаныя «*», рэкамендуецца замаўляць у аднаго пастаўшчыка (напрыклад, канферэнц-цэнтра, гатэля і г.д.)*

4.4. Усе запытаныя выдаткі павінны быць апраўданымі, абгрунтаванымі і адпавядаць патрабаванням рацыянальнага фінансавага менеджменту, у прыватнасці, у дачыненні да эканоміі і эфектыўнасці.

**4.5. Запытаная падтрымка не можа выкарыстоўвацца для аплаты:**

- рахункаў, якія патрабуюць пераводу сродкаў у банкі Беларусі і Расіі або ў іншыя банкі, да якіх ужываюцца санкцыі ЕС;
- працы супрацоўнікаў арганізацыі, не звязаных непасрэдна з правядзеннем узгодненай дзейнасці;
- выдаткаў на арэнду і абслугаванне офіса (напрыклад, камунальных плацяжоў);
- камунікацыйных выдаткаў (тэлефон, інтэрнэт, пошта);
- куплі абсталявання;
- выдаткаў на рэкламу ў Сеціве.

4.6. У межах конкурсу можа запытаць суфінансаванне іншых праектаў, якія адпавядаюць мэце конкурсу.

4.7. Для рэалізацыі праекта па падтрыманай заяўцы з грантаатрымальнікам будзе заключана пагадненне аб мэтавым фінансаванні.

## 5. ПРАЦЭДУРА ПАДАВАННЯ ПРАЕКТНЫХ ПРАПАНОЎ

5.1. Праектная прапанова ўключае заяўку і бюджэт праекта, запоўненыя на рускай ці беларускай мове. Пакет заяўкі таксама ўключае падпісаную дэкларацыю заяўніка. В межах конкурсу будуць разгледжаны толькі тыя праектныя прапановы, якія былі складзены з выкарыстаннем **формы заяўкі і бюджэту** дадзенага конкурсу.

5.2. Заяўкі прымаюцца на электронны адрас **cs4b@protonmail.com** з адрасу электроннай пошты, зарэгістраванага на сэрвісе ProtonMail. Калі на вашым камп'ютары не адкрываецца сайт ProtonMail, просім вас выкарыстоўваць сэрвіс VPN.

5.3. Заяўкі прымаюцца і будуць разглядацца ацэначнай камісіяй паводле наступнага графіку:

| **Апошні тэрмін падавання заяўкі** | **Абвяшчэнне рашэння ацэначнай камісіі** | **Дата пачатку выканання праектаў** | **Максімальная працягласць праектаў** |
|---|---|---|---|
| Заяўкі прымаюцца на сталай аснове з 20 лістапада па 31 снежня 2023 года або да моманту, пакуль грантадаўца не абвесціць аб спыненні конкурсу | Рашэнні аб падтрымцы будуць прымацца цягам аднаго месяца з моманту атрымання заяўкі | Не раней за 1 лютага 2024 | Да 5 месяцаў |

5.4. Усе праекты, падтрыманыя ў межах конкурсу, павінны завяршыцца **да 30 чэрвеня 2024 года**.

## 6. АЦЭНКА І АДБОР ПРАЕКТНЫХ ПРАПАНОЎ

6.1. Для ацэнкі праектных прапаноў, якія адпавядаюць названым вышэй патрабаванням, ацэначная камісія выкарыстоўвае наступныя крытэрыі:

| **Крытэрыі** | **Максімальны бал** |
|---|---|
| **1. Патэнцыял заяўніка для рэалізацыі праекта** | |
| 1.1. Ці валодае заяўнік дастатковым досведам кіравання праектамі? | 5 |
| **2. Рэлевантнасць праекта** | |
| 2.1. Наколькі праектная прапанова адпавядае мэце конкурсу? | 5 |
| 2.2. Наколькі праектная прапанова адпавядае спецыфічным патрэбам і праблемам заяўніка? | 5 |
| **3. Дызайн праекта** | |
| 3.1. Наколькі лагічным з'яўляецца праект? Ці з'яўляецца прапанаваная дзейнасць неабходнай, выканальнай і ці забяспечвае атрыманне чаканых вынікаў? | 10 |

| | |
|---|---|
| 3.2. Ці з'яўляюцца вынікі дасягальнымі і вымяральнымі? | 5 |
| **4. Падыход да рэалізацыі праекта** | |
| 4.1. Наколькі зразумелы і ажыццяўляльны план дзеянняў па рэалізацыі праекта? | 5 |
| 4.2. Ці з'яўляюцца тэрміны рэалізацыі праекта рэалістычнымі? | 5 |
| **5. Устойлівасць праекта** | |
| 5.1. Ці ўстойлівыя чаканыя вынікі прапанаванага праекта? | 10 |
| **6. Бюджэт і эканамічная мэтазгоднасць праекта** | |
| 6.1. Ці слушна адлюстраваны мерапрыемствы праекта ў бюджэце? | 10 |
| 6.2. Ці з'яўляюцца здавальняючымі суадносіны меркаваных выдаткаў і вынікаў праекта? | 10 |
| **РАЗАМ** | **70** |

6.2. Плануецца, што ў межах конкурсу будзе падтрымана 8-10 заявак (у залежнасці ад якасці пададзеных заявак і іх бюджэту).

6.3. Па выніках разгляду заявак ацэначнай камісіяй конкурсу папярэдне зацверджаныя праекты могуць быць накіраваныя на дапрацоўку. Канчатковае рашэнне аб падтрымцы такога праекту будзе прынятае пасля ўнясення заяўнікам адпаведных змяненняў у заяўку або бюджэт праекта.

6.4. Рашэнне аб падтрымцы любога праекта, пададзенага на конкурс, мае папярэдні характар непасрэдна да падпісання пагаднення з заяўнікам. Фінальнае рашэнне залежыць ад своечасовай камунікацыі з боку заяўніка, падаванні на просьбу грантадаўцы ўсёй інфармацыі, неабходнай для падпісання пагаднення аб фінансаванні, ад паўнаты і дакладнасці такой інфармацыі. Калі заяўнік не будзе своечасова і поўна падаваць інфармацыю і адказваць на пытанні грантадаўцы без папярэдняга паведамлення або падасць няпоўную або недакладную інфармацыю, рашэнне аб падтрымцы праекта можа быць скасавана на гэтай падставе.

## 7. ДАДАТКОВАЯ ІНФАРМАЦЫЯ І ПЫТАННІ

7.1. З дадатковай інфармацыяй аб конкурсе, формамі заявак, адукацыйнымі матэрыяламі і адказамі на пытанні, якія часта задаюць, можна азнаёміцца на сайце www.cs4b.info.

7.2. Пытанні, што датычацца ўмоў конкурсу і падавання праектных прапаноў, можна накіроўваць на тэлеграм-акаўнт @CSforB, праз электронную пошту cs4b@protonmail.com і праз форму на сайце. Арганізатары конкурсу будуць адказваць на пытанні ў працоўныя дні з 10:00 да 18:00 па беларускім часе.